*ARKUSZ ZAWIERA INFORMACJE PRAWNIE CHRONIONE DO MOMENTU ROZPOCZĘCIA EGZAMINU!*

**Miejsce na naklejkę**

*dysleksja*

**MOB-R1_1P-082**

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM ROZSZERZONY

**Czas pracy 180 minut**

**MAJ ROK 2008**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 14 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie podlegają ocenie.
5. Możesz korzystać ze słowników językowych.
6. Na karcie odpowiedzi wpisz swoją datę urodzenia i PESEL. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.

*Życzymy powodzenia!*

Za rozwiązanie wszystkich zadań można otrzymać łącznie **60 punktów**

*Część I – 15 pkt*
*Część II – 45 pkt*

**Wypełnia zdający przed rozpoczęciem pracy**

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | |

**PESEL ZDAJĄCEGO**

| | | |
|---|---|---|
| | | |

**KOD ZDAJĄCEGO**

## Część I – rozumienie czytanego tekstu

**Прачытай уважліва тэкст Міхася Шавыркіна і адкажы на пытанні. Пішы коратка, згодна з патрабаваннямі.**

Міхась Шавыркін

***Каб любіць Беларусь нашу мілую...***
(скарочана)

**1.** *...трэба проста любіць яе.* [...] Любоў наладжвае гармонію ў людскіх дзеяннях, справах, ператварае існаванне чалавека, грамады ў змястоўнае, стваральнае жыццё. Калі любіш – усё навокал чароўна змяняецца, свет робіцца прыцягальна прыгожым, утульным, велічным. І тады апаноўвае жаданне тварыць...

**2.** Беларусь нельга не любіць, ёю немагчыма не захапляцца. Гэта дзівосны край. Яго краса апета ў песнях, услаўлена ў мастацкіх творах, а гісторыя пазначана росквітам талентаў і мужнымі ўчынкамі нараджэнцаў і супольнікаў. Беларусь – прыласканая[1] Богам зямля. Тут усе знаходзяць духоўны прытулак. Хто душою пранікся да яе абшараў, успрыняў іх маляўнічасць, той адчувае надзвычай моцны пачуццёва-інтэлектуальны прыліў, творча натхняецца, атрымлівае духоўную загартоўку.

**3.** Каб беззапаветна любіць сваю Радзіму, Айчыну, трэба мець развітую душу, здольную тонка ўспрымаць і перажываць. І трэба шмат ведаць. Наша любоў да роднай старонкі – гэта найперш напружаная дзейнасць душы: уменні пераствараць свае захапленні ў радасць і ёю адорваць усіх, хто побач. Любоў – гэта майстэрства і мастацтва ствараць вакол сябе райскую атмасферу. Так вучыць нас Прырода. [...] Клопат пра развіццё дзіцячых душаў кладзецца на бацькоў і педагогаў. Яны мусяць навучыць дзяцей і падлеткаў успрымаць разнастайныя нюансы і адценні разлітага ў наваколлі хараства і памнажаць яго – і тым самым дапамагаць маладому пакаленню фармаваць развітую душу. Гэта – святы бацькоўскі і педагагічны абавязак, ускладзены Прыродай. [...]

**4.** Не адразу ўспрымаецца і спазнаецца беларускі край. [...] Ды і самі насельнікі ўсё болей адасабляюцца ад наваколля. Сучасныя ўмовы існавання, абсталяваныя дасканалымі тэхнічнымі прыладамі і сістэмамі, не надта спрыяюць глыбокаму пачуццёваму спасціжэнню сутнасці прыродных аб'ектаў і працэсаў. А Беларусь – не толькі частка еўрапейскага кантынента, пазначаная межавымі слупамі. Беларусь – магутная духоўна-энергетычная зона планеты. Тут пушчы і гаі, рэчкі і азёры, лугі і балоты ўтрымліваюць велізарны аб'ём прыроднай духоўнасці, вельмі патрэбнай для развіцця людскіх душаў. [...] Гэтая высакародная энергія сілкуе[2] душы людзей, натхняе іх на творчасць, на распрацоўку светланосных ідэй, якія вядуць да якаснага ўдасканалення чалавецтва. [...]

**5.** Беларусь трэба ведаць. І ведаць трэба дэталёва, каб творча працаваць на яе абшарах, каб наладжваць гарманічную дзейнасць, пашыраць любоў, несці радасць. Сама Беларусь як частка зямной прасторы, што існуе аб'ектыўна (без умяшальніцтва людзей у працэс яе развіцця), паўстае ў трох абліччах: *Беларусь геаграфічная* (фізічнае), *Беларусь навуковая* (рацыянальнае/разумовае) і *Беларусь мастацкая* (духоўнае). Да гэтага часу Беларусь-аб'ектыўную ўспрымаем і даследуем толькі на фізічным узроўні: адзначаем дабратворнае хараство краявідаў ды багацце нетраў. Духоўна-інтэлектуальны аспект нашага краю не ўспрымаецца насельнікамі

[1] прыласканая – абдорана ласкай
[2] сілкаваць – забяспечваць чым-небудзь неабходным для нармальнага дзеяння, функцыяніравання

і застаецца па-за іх увагаю. Затое суб'ектыўны аспект Беларусі як часткі чалавецтва асветлены шырока. Гісторыя, навука, культура (літаратура, музыка, выяўленчае мастацтва[3] і інш.) Беларусі пададзены праз дзейнасць тутэйшых людзей, іх дасягненні. І Беларусь-аб'ектыўная (як частка планеты) успрымаецца праз Беларусь-суб'ектыўную (як частку чалавецтва) – праз стваральную працу яе насельнікаў і нараджэнцаў. […]

**6.** Гэтак пададзена Беларусь і ў навучальных праграмах: Беларусь-аб'ектыўная – толькі на фізічным узроўні; шматаспектна – Беларусь-суб'ектыўная. Аднак асвятленне духоўнага развіцця насельнікаў нашага краю і іх дасягненняў застаецца прыцемненым. У выніку выпускнікі навучальных устаноў не атрымліваюць выразнага ўяўлення пра духоўную культуру краіны. З усёй мастацкай сферы больш шырока прадстаўлена літаратура, але яе сучасны стан пададзены фрагментарна. Музыка і выяўленчае мастацтва не трапляюць у зону асветніцкага вывучэння, нават знаёмства з дзейнасцю асобных творцаў адбываецца павярхоўна. Моўная культура пакідаецца за межамі заняткаў, а роля мовы тытульнай нацыі – роднай мовы, якая духоўна яднае ўсіх насельнікаў краіны між сабой і з навакольнай прасторай (Прыродай), далучае іх душы да мясцовага духоўна-энергетычнага поля, істотна зменшана. Атрымліваецца, што агульнанавучальны працэс накіраваны пераважна на назапашванне[4] школьнікамі толькі галіновых ведаў і не працуе на фармаванне іх пачуццёвай сістэмы, развіццё душаў. Змест падручнікаў не адлюстроўвае мэт, для ажыццяўлення якіх робяцца сацыяльныя рэформы, перабудовы, рэвалюцыі на планеце. […] Гэта грунтоўныя пралікі[5] ў адукацыйнай сістэме (і айчыннай, і замежнай)... І яны маюць сацыяльна небяспечныя наступствы: дзеці, падлеткі растуць у бездухоўнай атмасферы, у затэхнізаваных умовах яны пастулова страчваюць пачуцці суперажывання і любові, перастаюць успрымаць іншых, адчуваць іх боль, што рана ці позна прыводзіць да амаральных учынкаў.

**7.** Нішто так моцна і станоўча не ўздзейнічае на дзіцячую пачуццёвую сістэму як высокадухоўныя творы і гучанне роднай мовы. Духоўная культура актыўна ўплывае на фармаванне гарманічна развітой асобы, выхаванне патрыятызму, грамадзянскасці школьнікаў. І найбольш прыдатныя ў гэтай педагагічнай справе – творы айчыннай літаратуры, музыкі, выяўленчага мастацтва. Яны не толькі адлюстроўваюць прыгажосць роднага краю, услаўляюць стваральную дзейнасць суайчыннікаў, але і перадаюць яго прыродную энергію, акумуляваную творцамі ў арганічным спалучэнні зместу і формы, адметнай мастацкай вобразнасці. Успрыманне мастацкіх твораў – урокі патрыятызму, у час якіх нязмушана, нават непрыкметна, спакваля[6] фармуюцца адна за адной рысачкі святой любові да Айчыны.

*М. Шавыркін,Каб любіць Беларусь нашу мілую..., [у:] Роднае слова, 2006, № 1, с. 3–4.*

[3] выяўленчае мастацтва – агульная назва мастацтва, якое перадае вобразы на плоскасці і ў прасторы (жывапіс, графіка, скульптура, архітэктура)
[4] назапашванне – ад назапасіцца – запасціся чым-небудзь у вялікай колькасці
[5] пралік – памылка, промах, няўдача
[6] спакваля – паступова, марудна, павольна

## Заданні да тэксту

### Заданне 1 *(2 пункты)*
**Выпішы дзве метафары, якія адносяцца да любві, выкарыстаныя аўтарам у 1 і 3 абзацах і дай іх інтэрпрэтацыю.**

- «любоў наладжвае гармонію ў людскіх дзеяннях, справах» - любоў дапамагае падыходзіць спакайней да жыцця;
- «любоў – гэта майстэрства і мастацтва ствараць вакол сябе райскую атмасферу» - дзе ёсць любоў – там людзі жывуць у згодзе, без сварак;

### Заданне 2 *(2 пункты)*
**У 1 абзацы знайдзі два словы, утвараныя ад дзеяслова *тварыць* і растлумач іх значэнне.**

- Ператварае – змяняе, надае іншы выгляд
- Стваральне – якое фарміруе

### Заданне 3 *(1 пункт)*
**Якая моўная функцыя з'яўляецца галоўнай у 1 і 2 абзацах?**

а) экспрэсіўная;

б) эстэтычная;

в) інфармацыйная.

### Заданне 4 *(1 пункт)*
**У 2 абзацы Міхась Шавыркін называе Беларусь "дзівосным краем". Якія два доказы дае на гэта?**

- яе краса апета ў песнях, услаўлена ў мастацкіх творах;
- яе гісторыя назначана росквітам талентаў і мужнымі ўчынкмі нараджэнцаў;

### Заданне 5 *(1 пункт)*
**На аснове 3 абзаца напішы, чаму, паводле аўтара, дапамога ў фармаванні душы маладога пакалення з'яўляецца "святым бацькоўскім і педагагічным абавязкам" (дай два аргументы).**

Дапамога ў фармаванні душы маладога пакалення з'яўляецца «святым бацькоўскім і педагагічным абавязкам», каб дзеці патрапілі ўспрымаць і тонка перажываць навакольнае хараство, а таксама, каб выклікаць у іх любоў да роднага краю.

### Заданне 6 *(1 пункт)*
**На аснове 4 абзаца напішы, што перашкаджае поўнасцю зразумець сутнасць прыроды.**

Поўнасцю зразумець сутнасць прыроды першкаджаюць тэхнічныя прылады і сістэмы, якія адводзяць чалавека ад прыроды.

## Заданне 7 *(1 пункт)*
**На аснове 4 абзаца напішы, чаму Беларусь можна назваць “магутнай духоўна-энергетычнай зонай планеты”.**

Беларусь можна так назваць, таму што тут пушчы і гаі, рэчкі і азёры, лугі і балоты, якія ўтрымліваюць велізарны аб’ём прыроднай духоўнасці, вельмі патрэбнай для развіцця людскіх душаў.

## Заданне 8 *(1 пункт)*
**У 5 абзацы можам прачытаць, што, паводле Міхася Шавыркіна, “Беларусь як частка зямной прасторы [...] паўстае ў трох абліччах”, якія ствараюць Беларусь-аб’ектыўную. Толькі адно з іх не застаецца па-за ўвагаю насельнікаў. Якое?**

а) Беларусь геаграфічная.
б) Беларусь навуковая.
в) Беларусь мастацкая.

## Заданне 9 *(1 пункт)*
**На аснове 6 абзаца напішы, чаму, паводле аўтара, духоўнае развіццё насельнікаў Беларусі з’яўляецца недастатковым.**

Духоўнае развіццё насельнікаў Беларусі з’яўляецца недастатковым, таму што маладыя беларусы не знаюць дастаткова сваёй культуры, вучацца яе недакладна. Дзеці растуць у бездухоўнай атмасферы.

## Заданне 10 *(1 пункт)*
**На аснове 6 абзаца апішы галоўны закід аўтара ў адносінах да вывучэння беларускай мовы ў школе.**

Роля беларускай мовы, якая духоўна яднае ўсіх насельнікаў краіны, на занятках у школе істотна зменшана.

## Заданне 11 *(1 пункт)*
**У 7 абзацы знайдзі сінонімы да слоў і словазлучэнняў:**

любоў да Айчыны – патрыятызм

незаўважна – непрыкметна

землякі – суайчыннікі

## Заданне 12 *(1 пункт)*
**Да выкарыстаных аўтарам у 7 абзацы слоў, дапішы антонімы:**

станоўча – адмоўна

любоў – нянавісць

актыўна – пасіўна

## Заданне 13 *(1 пункт)*

**Тэкст Міхася Шавырыкіна датычыць галоўным чынам адносін між**

а) патрыятызмам і мастацтвам.

б) патрыятызмам і адукацыяй.

в) патрыятызмам і паэзіяй.

## Część II – pisanie własnego tekstu w związku z tekstem literackim zamieszczonym w arkuszu.

**Arkusz zawiera dwa tematy sprawdzające umiejętność pisania własnego tekstu związanego z tekstem literackim dołączonym do tematu. Wybierz jeden z tematów i napisz wypracowanie. Wybrany temat podkreśl.**

Тэма 1:

**На аснове аналізу і інтэрпрэтацыі вершаў *Малітва* Масея Сяднёва і *Малітва* Наталлі Арсенневай параўнай спосабы правядзення і мэты лірычнай размовы з Богам.**

Масей Сяднёў

***Малітва***

На коміне фабрычным сонца дагарае,
а мне дахаты йсці ці хутка?
Пад карканне варон – крыклівай зграі –
шапчу малітвы я ціхутка.
Каб шчасце ў кутку маім вялося,
як птушка ценькая[7] пад ветлым дахам,
каб хлеб і соль былі, а ўвосень
вятры не білі акяніцамі з размаху.
Каб сцерпець абыякавасць чужыны,
суродзічаў пыхлівых холад думны,
патрыятычную іх сліну,
парадны тупат тлумны.

Каб пры канцы шляхоў маіх далёкіх,
што не ўкладаюцца ні ў вёрсты і ні ў мілі,
не помнячы грахоў і крыўдаў лёгкіх,
прыхільныя багі мяне багаславілі.

*М. Сяднёў, Малітва, [у:] Б. Сачанка, Туга па Радзіме. Паэзія беларускай эміграцыі, Мінск 1992, с. 349.*

[7] ценькі – вельмі высокі па гучанню, падобны на піск

Наталля Арсеннева

**_Малітва_**

Магутны Божа! Ўладар сусветаў,
вялізных сонцаў і сэрц малых,
над Беларусяй ціхай і ветлай
рассып праменне Свае хвалы.
Дай спор[8] у працы будзённай, шэрай,
на хлеб штадзённы, на родны край.
Павагу, сілу і веліч веры
у нашу праўду, у прышласць – дай!
Дай урадлівасць жытнёвым нівам,
учынкам нашым пашлі ўмалот[9].
Зрабі свабоднай, зрабі шчаслівай
краіну нашу, і наш народ!

*Н. Арсеннева, Малітва, [у:] Б. Сачанка, Туга па Радзіме. Паэзія беларускай эміграцыі, Мінск 1992, с. 88.*

Тэма 2:

**На аснове інтэрпрэтацыі дадзеных фрагментаў *Споведзі* Ларысы Геніюш ахарактарызуй адносіны пісьменніцы да Айчыны. Звярні ўвагу на жанравую адметнасць твора.**

Ларыса Геніюш

**_Споведзь_**
(фрагменты)

Благаславенны родны дом, гдзе[10] бацькі і ўся дарагая сям’я. Благаславенны маленькі кусочак роднай, бацькавай зямлі на вялізнай планеце, які называўся Жлобаўцы. Называўся, бо сяння яго няма, таго нашага фальварачка, і нават яго назовы[11]. Там калгас з нейкай ультрасавецкай назовай, дом перавезены ў Ваўкавыск, разам з гумном, а там, гдзе была наша сяліба, стаіць толькі даўгі мураваны хлеў і некалькі дрэў, якіх яшчэ не паспелі выкарчаваць на апал сяляне. […]

Часам доўга ўглядаюся на сцежкі свае маладосці – ажываюць успаміны, і здаецца мне: спрацаваныя матчыны рукі туляць мяне ласкава да сэрца, алеяю, ці, як мы казалі, – прагонам, шырака крочыць тата, я яму толькі па бараду, і, угледзеўшы мяне, ён заўсёды ўсміхаецца пад сваімі крыху рыжымі вусамі, заўсёды падзеліцца думкамі накшталт: «Полацкае княства сяння[12] зрабілі непапулярным са страху, каб не сепаравалася па праву ад імперыі, але ці ты думаеш, што твая Беларусь утрымаецца эканамічна, калі б была самастойнай?» Тата ведае чым жыву, і часамі хоча мяне паквяліць[13], як малое дзіця. Крыху спрачаемся, мае ідэі для яго, з дзядоў ужо

[8] спор – поспех, удача
[9] умалот – ураджай
[10] гдзе – сучасна: дзе
[11] назова – сучасна: назва
[12] сяння – сучасна: сёння
[13] паквяліць (дыял.) – падражніць, даводзіць да слёз

нявольнага, як экзотыка. Тата ведае, чым за гэта плаціцца, і паглядае на мяне з нейкай чуласцю сумнай. […]

Я была найстаршай удома з дзяцей і, здаецца, найболей каханай бацькамі, брацікамі, Люсяй і слугамі. Ксеня й Ніна мяне не любілі. Новы вялікі дом, і ўсе ўдома. Цяжка было знайсці адпаведную працу пры Польшчы, асабліва калі бацькі былі больш--менш забяспечаныя, на вышэйшую адукацыю не было матэрыяльных магчымасцяў, заставалася працаваць на зямлі й чакаць мужа. Падсведама і я думала аб мужу нейкім, але ён мусяў[14] быць Беларус. Такіх не было, толькі сяляне, усё роўна муж мой будзе Беларус! А сватоў было шмат, даходзіла да трагедыяў, часам да смеху. Мы былі праваслаўныя, вось і сваты ад маладых святароў пачыналіся. […] Часам людзі мяне ледзь толькі бачылі, а ўжо прасілі мае рукі. Гэта было дзіўна, несамавіта. Мама іх усіх не любіла, а яе прыяцелька, пані Ядвіга Зелянкевічыха, гаварыла: «Няма кавалера для панны Ларысы, толькі Пілсудскі!» Гэта быў вялікі камплімент, у якім пані Ядвіга абсалютна забывалася аб познім веку польскага маршала й думала толькі аб яго знатнасці. Для мяне нават ён не прыйшоў бы ва ўвагу, бо ж быў не беларус... […]

Зямля была для нас усім: калыскай, хлебам, песняй, любоўю, магілай. Чым больш зямлі, тым болей надзейнае заўтра, ніякае надзеі больш на ратунак. […]

Сумна падышоў раз мой тата да мяне – на пошце ў Воўпе яму парадзілі[15], каб дачка кінула выпісваць беларускі друк, а выпісвала я толькі правыя[16] выданні, бо там было нешта з таго, што я так пакахала ў сваім народзе. Я нарадзілася такой, ад пялюшак ужо прасякнутай усім, што наша, з болем і прагай змагання за волю й нашую зямлю для нас. […]

Час ляцеў, і зімою перад Новым годам мой дарагі будучы муж апавясціў аб сваім прыездзе. Я не вельмі ўсцешылася, не тое было ў галаве, хацела нат[17] напісаць, каб не ехаў, бо надта былі маразы, але паслалі ў Рось на станцыю добрыя коні, бурку цёплую, з якой шпарка выскачыў ля ганка стройны, худы, выгалены, элеганцкі Янка Генюш, пражскі студэнт і амаль ужо доктар! Была гэта не простая штука, гутарыў пераважна з мамаю, якую ачараваў, а мне абяцаў разам, да канца нашых дзён, змагацца за Беларусь... Дамоў ужо не паехаў, толькі па паперы – каб ажаніцца. Відно было, што чалавек моцна пастанавіў нешта, не мог спакойна прайсці ля мяне й лапаў усё, не толькі за рукі, аж я зазлавалася. Вечарам запаліла лямпу й думаю: панясу яму – а быў ён у маім пакоі, – калі будзе няветлівы, дык я яму такога нагавару, што адразу заверне аглоблі[18], я яму пакажу вось цяпер, менавіта калі мы адзін на адзін! Уваходжу з лямпай, як каралева, падняўшы высака галаў. Мой будучы друг ветліва за яе дзякуе, цалуе мяне ў руку, і абое спакойна жадаем сабе добрае ночы... Такое джэнтэльменства мяне канчаткова паканала, да таго цудоўная гутарка беларуская, шырокая нейкая, нескупая натура гэтага беднага студэнта – усё раптам зрабілася мне несказана дарагім, і я падзякавала Богу ў душы за тое, што Ён усякімі дзіўнымі дарогамі прывёў яго з далёкіх Чэхаў у нашую хату. Неўзабаве згулялі вяселле. Белыя коні ў лёгенькіх санках чакаюць. Бацькі нас благаслаўляюць абразамі, мы на каленях, пацалункі, раздзіраючы плач мамы, у Славачкі капаюць слёзы, Люся плача ўздрыгам. Пад пятку ў мой белы пантофлік палажылі грошы, каб яны вяліся ў мяне, у рукі далі цукар. Трэба кідаць яго на коні, дык будзе жыццё салодкае... Я ўсё выпаўняю. У царкве поўна народу. Мне сказалі: ідучы кругом алтара, наступаць мужу лёгка на нагу, гэта каб слухаўся... Перад вянчаннем яшчэ падышоў дружбант і шапнуў мне, каб моцна трымала мужа пад руку ў царкве, каб ніхто між намі не прайшоў, што ён сам хацеў мне зрабіць гэта, але цяпер каецца... І так моцна трымаю сваяго сужанага, цалуемся, нас вітаюць. Мой «атэіст» толькі й рабіў,

[14] мусяў – сучасна: мусіў
[15] парадзілі – сучасна: параілі
[16] правы – справядлівы, праўдзівы
[17] нат – сучасна: нават
[18] заварочваць аглоблі – адыходзіць ці ад'язджаць назад

што хрысціўся, калі нас вянчалі, знача[19], дзякую Богу... Удома чакаюць нас госці, і далей усё – як на вяселлі: падаркі, госці давідна, муж мяне носіць на руках, нават без вялікае намогі, і адразу адвозіць мяне ў Зэльву. […]

Мне сумна, я многа тут пакідаю ў бацькаўскай сялібе, гэтым жыць буду вечна я й маё пяро. За сабою я пакідала ўлюбёны прастор палёў, якія мяне ўзгадавалі, труднае жыццё, нялёгкую працу ў полі й на вялікай гаспадарцы, тапалёвы гай ля хаты й лес, які сама садзіла. Ён так хараша рос і ўжо гадаваў маслячкі, рыжыкі. Тую вёску, якая мне столькі падсказала з мінулага, замурзаную крыху мо[20], але з душою, бы тая раса, якую я так разумела. Песні яе пайшлі следам за мною. І я пакідала сваю сям'ю й той пятачок зямлі на вялікай планеце, мае Жлобаўцы, гдзе я ніколі не сумавала й не трэба мне было ніякага таварыства, калі было поле, наш дом і лес; і весела сярод альшыны якраз праз нашыя лугі працякала любая рэчка Ваўпянка, поўная шчупакоў, плотак і багатая ракамі. Сумна мне будзе без таты, ён вельмі разумны, нейк[21] усё бачыць, быццам адчувае наперад, толькі жаль мне, што Жлобаўцаў не разбудоўвае, не засаджвае болей садамі й лесам, жывецца там нейк з дня на дзень... Калі за нашай хатаю заходзіць сонца, дык робіцца аж страшна, быццам нехта адыходзіў назаўсёды. Халадок і ноч кладзецца на мае Жлобаўцы, як чорная небяспека, як прадчуццё таго, што пасля прыйшло. Вось і тата мой прадчуваў гэта ўсё відавочна й не разбудоўваў свой кут на вякі. Гэта ўжо здалёк рысавалася на небасхілах вайна і тое, што ходзіць з ёю.

*Л. Генію ш, Споведзь, [у:] М. Скобла, Ларыса Геніюш. Выбраныя творы, Мінск 2000, с. 221-231.*

# CZYSTOPIS

**Тэма 1:**

Малітва, на маю думку, з’яўляецца элементам кантакту з Богам, які дапамагае нам у штодзённым жыцці. Цераз малітву мы можам гаварыць з Богам, а таксама дзякаваць Яму, ці прасіць Яго, каб крыху нам дапамагаў.

На прыкладзе двух аднаіменных вершаў «Малітва» – Масея Сяднёва і Ларысы Геніюш, я паспрабую параўнаць, у які спосаб адбываецца лірычная размова з Богам
і якая яе тэма.

Верш Масея Сяднёва ёсць тыпова сучасным творам, апісвючым той сам свет
з «фабрычным комінам», у якім прыйшлося жыць як аўтару, так і нам. Лірычны герой, якога можам параўнаць з самім аўтарам, задумоўваецца, ці ісці яму хутка дахаты (ужо ёсць вечар: «На коміне фабрычным сонца дагарае»), ці яшчэ не. Ён, нягледзячы на тое, што перашкаджае яму галоснае карканне варон – «крыклівай зграі», шэпча сваю ціхую малітву. Пачаткова гэтая малітва ёсць вельмі звычайнай, нагадвае малітвы, якія мы гаворым вечарам. Лірычны герой просіць пра звычайныя рэчы: каб «шчасце ў яго кутку вялося», «каб хлеб і соль былі», каб «вятры не білі аканіцамі з розмаху» ўвосень.

[19] знача – сучасна: значыць
[20] мо – сучасна: можа
[21] нейк – сучасна: неяк

Пазней яго малітва набірае іншага значэння, іншага сэнсу, пачынае быць рэфлексійнай размовай. Лірычны герой просіць дапамогі, каб «сцерпець абыякавасць чужыны», а таксама «суродзічаў пыхлівых холад думны. Звяртае ўвагу таксама на іхні «патрыятызм» і «парадны тупат тлумны». Лірычны герой просіць таксама памятаць пра яго ў час канца яго жыццёвай вандроўкі. Просіць ён і таго, каб «прыхільныя багі» не помнілі яго «грахоў і крыўдаў лёгкіх» і благаслаўлялі яго ў той час, калі ён ужо наступіць.

Верш Масея Сяднёва пабудаваны з трох кароткіх строфаў: у першай чатыры радкі, другой – восем, у апошняй, таксама як і першай – чатыры. Такім чынам, верш мае клямарную пабудову. У ім вельмі многа мастацкіх сродкаў, такіх як: эпітэты («крыклівай зграі, « шапчу малітвы я ціхутка », «ветлым дахам») дзеля ўпрыгожвання аўтарскага выказвання; параўнанні («шчасце, як птушка ценькая пад ветлым дахам»), каб звярнуць увагу чытача на некаторыя аспекты. У вершы выступаюць таксама метафары: «суродзічаў пыхлівых холад думны».

Другім вершам, які я разгляну, будзе «Малітва» Наталлі Арсенневай. Твор пачынецца зваротам да Бога: «Магутны Божа». Лірычны герой, якога можам атаесаміць з паэткай, з'яўляецца перад усім беларусам, які звяртаецца да Бога з просьбай, каб Ён дапамог усяму беларускаму народу і яго айчыне. Называе Бога «уладаром сусвету», таксама «вялізных сонцаў», як і «сэрц малых». Просіць, каб Бог рассыпаў праменні сваёй хвалы над Беларуссю. Таксама звяртаецца, каб Ён даў удачу ў працы, на хлеб, на «родны край». Найбольш важнай для лірычнага героя ёсць прышласць і дастатак яго народа, яго айчыны. Герой ведае, што жыццё беларусаў залежыць ад прыроды, таму просіць у Бога добрага ўраджаю, каб людзі мелі што есці. Вельмі вымоўнымі з'яўляюцца дзве апошнія страфы верша: «Зрабі свабоднай, зрабі шчаслівай / краіну нашу, і наш народ!» Знаходзім тут вялікую веру чалавека ў моц Бога.

Верш Наталлі Арсенневай з'яўляецца стыхічным, у якім аднак, нягледзячы на тое, што ён вельмі кароткі, знаходзім шматлікія мастацкія сродкі: эпітэты («сэрц малых», «працы будзённай», «хлеб штадзённы», «родны край»), метафары («учынкам нашым пашлі ўмалот»).

Дзве размовы з Богам, хаця ў іх аднолькавыя загалоўкі, дык выразна прыкмячаем значныя розніцы, якія паміж імі выступаюць. У першым вершы лірычны герой – мужчына, выступае ў першай асобе адзіночнга ліку. Ён звяртаецца з просьбай за шчасце і дабрабыт, перад усім сабе і сваёй сям'і. Другі лірычны герой – жанчына – атаесамліваецца з народам, з усёй Беларуссю. Просіць шчасця, дастатку і прышласці

ўсім беларусам. Таксама ў пабудове вершаў знойдзем некалькі розніц. Перад усім, верш Масея Сяднёва ёсць вершам страфічным, а верш Наталлі Арсенневай з'яўляецца стыхічным. «Малітва» Арсенневай пачынаецца апастрофай да самога Бога, а «Малітва» Сяднёва – не. Абодва вершы прадстаўляюць розныя спосабы правядзення размовы з Богам. Няхай кожны з нас сам падумае, які з твораў яму бліжэйшы.

**Тэма 2:**

Споведзь – гэта царкоўная тайна, пасля якой мы прыступаем да таямніцы Прычасця. У час споведзі мы стаім перад святаром і называем свае грахі. Мы шкадуем нашых дрэнных учынкаў і молімся да Бога, каб Ён нам прабачыў. Цераз таямніцу Споведзі і Прычасця мы можам даступіць Божай ласкі. Бог нам прабачыць і дасць новыя духоўныя сілы.

Твор пад загалоўкам «Споведзь» Ларысы Геніюш – гэта незвычайаная Споведзь. Загаловак твора мае метафарычнае значэнне. Ларыса Геніюш не стаіць перад святаром і не расказвае сваіх грахоў. «Споведзь» пісьменніцы – гэта гісторыя яе жыцця. Яна расказвае пра сваё жыццё, вядзе ўспаміны пра дзяцінства, хату, бацькоў.

Ларыса Геніюш жыла разам з бацькамі ў фальварку ў Жлобаўцах і была найстарэйшай дома сярод дзяцей. Вельмі любіла свой родны дом і сваю Малую Айчыну, якую звала «благаславенны маленькі кусочак роднай, бацькавай зямлі на вялізнай планеце». Яна кахала сваіх бацькоў, якія назаўсёды астануцца ў яе памяці.
З малых гадоў Ларыса была «прасякнута» беларускасцю. Захаплялася народнымі песнямі, выпісвала і чытала беларускія часопісы.

Яна шукала работы, бо хацела пастуціць у вышэйшую навучальную ўстанову, а ведала, што ў бацькоў не было матэрыяльных магчымасцяў. Знайсці адпаведную працу было вельмі цяжка, таму Ларысе «заставалася працаваць на зямлі й чакаць мужа». Ён, канешне, мусеў быць Беларусам. Ядвіга Зелянкевічыха казала, што для «Ларысы толькі Пілсудскі». Аднак Ларыса нават яго не хацела бо, міма таго, што ён вялікі маршал, ён – не Беларус.

Зямля была для яе і сям'і ўсім. Зімою, перад Новым годам, апавядаў аб сваім прыездзе яе будучы муж – Янка Геніюш. Ён быў студэнтам і амаль ужо лекарам. Яна не вельмі ўцешылася тым, што ён прыедзе і хацела, каб не прыязджаў, але потым дзякавала Богу за тое, што «Ён усякімі дзіўнымі дарогамі прывёў яго з далёкіх Чэхаў

у нашую хату». Неўзабаве згулялі вяселле. Яго наладзілі паводле старой беларуска-царкоўнай традыцыі: грошы ў пантофліку, у руках цукар. Муж забраў яе потым
з сабою ў Зэльву. Ёй было сумна, бо пакідала бацькоўскую сялібу і «ўлюбёны прастор палёў».

Апрача свайго жыцця, пісьменніца расказвае пра сваю Айчыну. Яна з'яўляецца вялікй патрыёткай. Кахае сваю родную старонку. Яна ўжо ад малой дзяўчынкі гаварыла, што яе будучы муж павінен быць Беларусам. Потым, калі яна выйшла замуж, вельмі неахвотна пакідала хату, бацькаўшчыну. Яе маленькі кусочак роднай бацькавай зямлі ўвесь час ажываў ва ўспамінах. Яна запамятала прыгожыя краявіды, палі, лясы, усё тое, што аставіла.

У «Споведзі» знаходзім шматлікія аўтабіяграфічныя элементы з жыцця Ларысы Геніюш: час праведзены ў Зэльве, нараджэнне сына, гады на эміграцыі ў чэшскай Празе, час вайны. Шчаслівыя гады пераплятаюцца з найбольш жорсткімі. Гэта твор, які даволі суб'ектыўна паказвае жыццёвыя лёсы пісьменніцы на фоне грамадска-палітычных падзей.

Чалавек, які не разумее Ларысы Геніюш, яе твора, мог бы сказаць, што яна грашыць, даючы такі загаловак свайму твору. Я, аднак, як веруючы праваслаўны чалавек, які ведае, што гэта любоў, разумею інтэнцыю Ларысы Геніюш. Яна так моцна кахае айчыну, што выносіць яе да святасці, зроўнівае Айчыну з Божай таямніцай. Для яе айчына святая.